**Свята роднай мовы (з нагоды Міжнароднага дня роднай мовы): пазакласнае мерапрыемства**



Школа, у якой я працую, налічвае 1027 вучняў і 138 педагогаў.

Была пастаўлена задача так арганізаваць свята роднай мовы, каб да беларускасці ў гэты дзень дакрануўся кожны, ад першакласніка да дырэктара школы.

Напярэдадні  дзевяцікласнікі разам з настаўнікамі  збіралі матэрыял для аматарскага фільма "Беларуская мова ў нашай школе": бралі інтэрв'ю ў вучняў і настаўнікаў, шукалі іншы відэаматэрыял аб тым, як жыве родная мова ў нашай школе.

Таксама  вучням і настаўнікам загадзя было прапанавана прынесці свае любімыя беларускія вершы ў друкаваным варыянце, з якіх была наладжана выстава " Нашы любімыя вершы", дзякуючы якой усе вучні школы маглі даведацца, які любімы верш у дырэктара школы, завуча, класнага кіраўніка ці дзяўчыны з паралельнага класа…

У прызначаны дзень наведвальнікаў школы сустракалі дзяўчаты ў беларускіх строях, якія нагадвалі аб свяце і прасілі напісаць свае любімыя беларускія словы, з якіх потым і была наладжана выстава"Мае любімыя беларускія словы". Як высветлілася, любімае беларускае слова ў нашай школе- каханне! Але сустракаліся і зусім незнаёмыя: прыгледзьцеся да фотаздымкаў.

Далей свята было арганізавана такім чынам, што на ўсіх перапынках на другім паверсе дэманстраваўся відэаматэрыял: фільм "Беларуская мова ў нашай школе", на якім шмат хто з вучняў мог спазнаць сябе і сваіх сяброў, музычныя сучасныя кліпы на беларускамоўныя песні, беларускамоўны мультматэрыял.
У гэты ж час на трэцім паверсе дзевяцікласнікі - арганізатары свята праводзілі інтэрактывы "Скарбонка роднай мовы"  і "Скарбонка народнай мудрасці ", якая, скажу шчыра, выклікала вялікую цікавасць у вучнў нашай школы.

Bankoboev.Ru

Змястоўнасці і значнасці мерапрыемству надала прэзентацыя кнігі "Ксты", якую Рыгор Барадулін даслаў у падарунак нашай школе. Падарунак передавалі старшакласнікі школьнай бібліятэцы.
Завяршала свята выступленне школьнага хора, які выконваў беларускае папуры проста ў фае школы. Напрыканцы ўжо спявалі амаль што ўсёй школай.
Свята атрымалася! Яно было не толькі вясёлым і шумным, але і вельмі карысным!

**Форма правядзення:** агульнашкольны інтэрактыў

**Мэта**: фарміраванне станоўчай матывацыі да вывучэння і ўжывання беларускай мовы

**Задачы**: папулярызацыя беларускай мовы праз знаёмства з навінкамі сучаснай беларускамоўнай культуры, міжасабовыя зносіны вучняў і настаўнікаў, актуалізацыю ведаў па беларускім фальклоры, лексіцы, паэзіі

***<u>Праграма мерапрыемстваў з нагоды Міжнароднага дня роднай мовы</u>***

***7.30.*** Акцыя "Мае любімыя беларускія словы" (на уваходзе ў школу)

***1 перапынак***



- Дэманастрацыя роліка " Родная мова ў нашай школе" , работа вучняў 9 "Б" класа ( фае, II паверх)

- Выстава "Мае любімыя беларускія словы" (фае, III паверх)



***2 перапынак***

- Выстава " Нашы любімыя беларускія вершы " (фае, III паверх)

-Дэманстрацыя музычнага мультыплікацыйнага фільма "Будзьма беларусамі" ( фае, II паверх)

- Дэманастрацыя мультыплікацыйнага фільма "Каму чорт дзетак калыша" ( фае, II паверх)

***3 перапынак***



- Беларускі музычны калейдаскоп : “Госці”,вык. гурт “Крамбамбуля”; “ Небасхіл “Еўропы”, вык.  Аляксандр Рыбак; “Такога няма нідзе “, вык. Лявон Вольскі, Уладзімір Пугач; “Каханне”, вык. Петр Клюеў;  ”Пахне чабор, вык. Лявон Вольскі; “Вуліца дым”, вык. гурт  HandmadE

- Інтэрактыў “Скарбонка роднай мовы” ( фае, III паверх)



***4 перапынак***

- Беларускі музычны калейдаскоп : “Люблю”, вык. гурт “Крамбамбуля” , “Купалінка, вык. Аляксандр Рыбак; ,”Туман ярам”, вык. гурт “ dzambibum”, “Мая Беларусь”, вык. Анастасія Віннікава, “Спадчына” , вык. Ірына Дарафеева і інш. ( фае, II паверх)



-Дэманстрацыя аматарскага роліка“Калядкі”, работа 11 “А” класа ( фае, II паверх)

-Інтэрактыў “Скарбонка народнай мудрасці ” ( фае, III паверх)



***5 перапынак***

“Шле вітанне вам беларускі хор”. Выступленне школьнага хора ( фае, II паверх)



**13.40**

Прэзентацыя кнігі “Ксты”-  падарунка народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна  бібліятэцы нашай школы (памяшканне школьнай бібліятэкі)